# XIII сесія Генеральнай Асамблеі ААН

НЬЮ-ЙОРК, 18 лістапада. (ТАСС). Учора ў пачатку ранішняга пасяджэння Палітычнага камітэта, які абмяркоўвае пытанне аб выкарыстанні касмічнай прасторы, з яркай прамовай выступіў дэлегат Румыніі С. Брукан.

Падтрымліваючы савецкі праект рэзалюцыі па абмяркоўваемаму пытанню, дэлегат Румыніі падкрэсліў, што гэты праект выходзіць з неаспрэчнага факту, што сапраўды плённае супрацоўніцтва ў мірным выкарыстанні касмічнай прасторы магчыма толькі пры ўмове ліквідацыі небяспекі ваеннага выкарыстання касмічнай прасторы.

Выступленне лідэра дэмакратычнай большасці сената ЗША Л. Джонсана звялося толькі да паўтарэння непераканаўчых довадаў у карысць амерыканскай рэзалюцыі.

Затым выступіў кіраўнік дэлегацыі Беларускай ССР К. В. Кісялёў.

## *Прамова К. В. Кісялёва*

Пан старшыня,

Панове дэлегаты,

Абмяркоўваемае намі пытанне аб касмічнай прасторы і ліквідацыі замежных ваенных баз на чужых тэрыторыях мае вялікае значэнне для народаў усяго свету.

Запуск штучных спадарожнікаў Зямлі, упершыню ажыццёўлены ў Савецкім Саюзе, адкрыў перад чалавецтвам век асваення космасу. Тое, аб чым толькі маглі марыць лепшыя розумы чалавецтва, пачало ўваходзіць у наша штодзённае жыццё. Літаральна з кожным днём усё бліжэй набліжаецца той час, калі касмічная прастора раскрые чалавеку свае тайны, калі палёты міжпланетных касмічных караблёў стануць такой жа звычайнай з'явай, як палёты самалётаў у наш час. Выдатныя дасягненні навукі, натуральна, аказваюць свой уплыў на ўсе бакі грамадска-палітычнага жыцця дзяржаў усяго свету, у тым ліку і на іх знешнюю палітыку.

...у сваім распараджэнні міжкантынентальныя балістычныя ракеты і што легенда аб «перавазе» ЗША ў галіне ракет і міф аб «непрыступнасці», «недасягальнасці» ЗША лопнулі як мыльная бурбалка, паставілі перад сабой задачу абараніць сябе ад небяспекі ўдараў у адказ і забараніць з гэтай мэтай выкарыстанне міжкантынентальных балістычных ракет і касмічнай прасторы ў ваенных мэтах, не ліквідаваўшы пры гэтым ні адной сваёй ваеннай базы, з якіх можна запускаць ракеты блізкага і сярэдняга радыуса дзеяння супраць СССР і іншых міралюбівых дзяржаў. У наяўнасці відавочная спроба паставіць Савецкі Саюз у нявыгаднае стратэгічнае становішча.

Аднак калі ЗША занепакоены бяспекай сваёй краіны, то чаму б ім не пайсці па шляху, які служыў бы інтарэсам міру і бяспекі народаў усіх краін? Вядома, што сама па сабе міжкантынентальная ракета

Трэба асабліва звярнуць увагу на паводзіны ўрада Італіі, які згадзіўся стварыць базы амерыканскіх ракет на сваёй тэрыторыі, матывуючы тым, што гэтыя базы неабходныя нібыта для ўмацавання «абароннай структуры Італіі».

Прадстаўнік Італіі пан Амбрасіні ў сваім выступленні 13 лістапада г. г. многа гаварыў аб юрыдычным аспекце касмічнай прасторы. Безумоўна, спрэчкі, якія вядуцца сярод юрыстаў усяго свету па пытанню аб прававым статусе касмічнай прасторы і нябесных целах, што знаходзяцца ў ёй, а таксама аб тым, што гэтыя нябесныя целы не могуць прысвойвацца якой-небудзь дзяржавай, заслугоўваюць нашай увагі. Але, на нашу думку, галоўнае цяпер не ў юрыдычных праблемах.

Прадстаўнік Італіі, выступаючы за забарону касмічнай прасторы ў ваенных мэтах, змоўчаў, аднак, аб тым, што італьянскі ўрад заключыў з ЗША пагадненне аб размяшчэнні і будаўніцтве на тэрыторыі Італіі амерыканскіх баз для запуску ракет сярэдняга радыуса дзеяння тыпу «Юпітэр» і «Тор». Дазвольна запытаць у прадстаўніка Італіі, супраць каго вы збіраецеся выкарыстаць гэтыя ракетныя базы? Адказ мы знаходзім у амерыканскім друку, які адкрыта паведамляе, што гэтыя базы будуць накіраваны супраць Савецкага Саюза і іншых сацыялістычных краін.

Размяшчэнне ракетных баз у такой густанаселенай краіне, як Італія, з'яўляец-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы